## «У думках я на Беларусь малюся...»

Постаць Уладзіміра Дубоўкі ў беларускай літаратуры авеяна легендамі і яркай славай паэта-наватара і паэта-грамадзяніна, чый бліскучы талент стварыў новы кранальны і ўзвышаны вобраз Беларусі часу бурлівых грамадскіх перамен. «О Беларусь, мая шыпшына, // зялёны ліст, чырвоны цвет! // У ветры дзікім не загінеш, // чарнобылем не зарасцеш...» — гэтыя сімвалічныя радкі паэта сталі прарочымі для роднага краю, можна сказаць, на ўсё XX стагоддзе.

Творы Уладзіміра Дубоўкі вабяць нас дагэтуль хараством і дасканаласцю мастацкай формы, нечаканасцю вобразных асацыяцый, глыбіннай сувяззю з традыцыяй і здольнасцю да смелых авангардных эксперыментаў. Яны маюць свой эстэтычны код і, з пункту гледжання сённяшняга гістарычнага і культурнага досведу, выяўляюць няпросты — палемічны і сімвалічны — дыялог паэта са сваёй эпохай. Гэты дыялог вёў Дубоўка ўсёй сістэмай паэтычных вобразаў, выяўляючы такім чынам уласны мастацкі феномен, які ў сваю чаргу ўплываў на агульную культурна-эстэтычную сітуацыю таго часу. Менавіта паэтычны свет Уладзіміра Дубоўкі ў многім вызначаў стыль і творчы кірунак літаратурнага аб'яднання «Узвышша», дый наогул утвараў вакол сябе культурную прастору, задаваў тон і служыў узорам для многіх іншых пісьменнікаў, прычым не толькі ўзвышаўцаў, але і тых, хто лічыў сябе іх апанентамі.

Жыццяпіс Уладзіміра Дубоўкі складаецца са слаўных і трагічных старонак, а ў яго біяграфіі выразна прасочваюцца тры лёсавызначальныя кругабегі: першы — зорны, у якім ён арганізатар «Маладняка» і «Узвышша», паэт-лідэр свайго пакалення, у цэнтры ўвагі чытачоў і крытыкі;

другі — пакутніцкі, у якім ён зазнае долю рэпрэсіравана-га,— зняволены і ссыльны, вязень сталінскага канцлагера і ўрэшце адпраўлены на «вечнае пасяленне» ў Краснаярскі край; трэці перыяд — пасля рэабілітацыі, які можна назваць мудра-цярплівым, калі паэт, вярнуўшыся пасля дваццаці сямі гадоў зняслаўлення і выгнання, зноў уключыўся ў літаратурнае жыццё 1960—1970 гадоў, напісаў нямала новых твораў, у тым ліку казкі і аповесці, а за цыкл вершаў «Палеская рапсодыя» ў 1962 годзе стаў лаўрэатам Літаратурнай прэміі імя Янкі Купалы.

Уладзімір Дубоўка нарадзіўся 15 ліпеня 1900 года ў вёсцы Агароднікі, якая па ранейшым адміністрацыйным падзеле ўваходзіла ў склад Віленскай губерні (цяпер — Пастаўскі раён Віцебскай вобласці). Скончыў Нова-Вілейскую настаўніцкую семінарыю (1918), паступіў у Маскоўскі універсітэт. Масква становіцца для Дубоўкі пастаянным месцам жыхарства, бо сямейныя абставіны склаліся так, што бацька яго, працаўнік чыгункі, у 1915 годзе, падчас ваеннага ліхалецця, выехаў з Беларусі, атрымаўшы працу па спецыяльнасці ў Маскве. Там сям'я і ўладкавалася на пастаяннае жыхарства, але ж сэрца Уладзіміра Дубоўкі належала Беларусі, што выразна праглядаецца ў яго вершах і ва ўсім стылі яго жыцця з пастаяннымі вандроўкамі на Беларусь. Маскоўскі універсітэт юнак не скончыў, бо мусіў перапыніць вучобу і працаваць, каб дапамагаць сям'і. Ён настаўнічаў на Тульшчыне, у 1920—1921 гадах служыў у войску, удзельнічаў ў Грамадзянскай вайне. Затым паэт зноў у Маскве, працуе інспектарам беларускіх школ пры Наркамаце асветы РСФСР. У гэты час ён часта ездзіць на Беларусь, актыўна займаецца літаратурнай працай, рыхтуе свой першы зборнік вершаў «Строма», вучыцца ў Вышэйшым літаратурным інстытуце імя В. Брусава ў Маскве.

Заняткі літаратурай захапілі Дубоўку. Глыбіня таленту, праніклівы розум, эрудыцыя ўвесь час цягнулі яго не толькі да паэтычнай творчасці, але і да навуковага беларусазнаўства. Аб гэтым сведчаць шматлікія артыкулы Дубоўкі ў часопісе «Узвышша», прысвечаныя беларускаму фальклору, музыцы, а таксама беларускай мове — яе лексічным і графічным асаблівасцям. Сам паэт, як вядома, быў вялікім наватарам у роднай мове, абнавіў яе слоўнік за кошт ажыўлення даўніх і забытых слоў, стварыў новыя словы і новыя граматычныя формы слоў (далавах, угрунь, цымбалеі, кіеўкі, ган, гас, адлюстроўваць, ускоўдрыць і інш.). На старонках часопіса «Узвышша» Дубоўка нязменна звяр-

таў увагу на культуру мовы, раіў унікаць у літаратурнай мове штучных калек, непатрэбных русізмаў. Ён вучыў маладых паэтаў чуйна адносіцца да мастацкага слова, пазбягаць безгустоўных вобразаў тыпу «лунных лапаў». Акрамя таго, паэт распрацаваў праекты графічных знакаў для перадачы на пісьме спецыфічных гукаў «дж» і «дз», якія, аднак, не прыжыліся ў практыцы.

У беларускай паэзіі імя Уладзіміра Дубоўкі становіцца вядомым з 1921 года, калі газета «Савецкая Беларусь» надрукавала яго верш «Сонца Беларусі». А ўжо ў 1923 годзе ў Вільні выйшла яго першая паэтычная кніга «Строма», якая выклікала заслужаную цікавасць і ўвагу чытачоў, крытыкаў, старэйшых пісьменнікаў. На яе цёплымі водзывамі адгукнуліся Змітрок Бядуля, Цішка Гартны, Антон Навіна (Луцкевіч). Вершы гэтай кнігі выяўлялі шчырую любоў маладога паэта да Беларусі, жаданне служыць ёй паэтычным словам, нягледзячы на адарванасць ад радзімы. У вершы «Не трэба мне пяяць на Беларусі?..» паэт знаходзіць вельмі прачулыя словы і вобразы, каб перадаць крэўную сувязь з родным краем і любоў да яго:

Матулі спеў, шматмілая старонка,
Купалы край, край чараўніц-дзяўчат!
Люблю цябе, бы татачку старога,
Як дзеваньку люблю, як брата брат!

З гэтым адчуваннем любові і крэўнасці пачаў Уладзімір Дубоўка свой шлях у літаратуру, то заглыбляючыся ў гістарычнае мінулае роднага краю, шукаючы там гераічныя постаці і легендарныя падзеі, то перадаючы сучасную яму дынаміку руху, імкненне ўслухацца ў рытмы кожнага новага дня — прадвесніка радаснай зорнай будучыні. У першым жа зборніку Дубоўка адкрывае сябе і як майстар вытанчанай вобразнасці, які ўмее бачыць красу ва ўсіх яе праявах — ад малюнкаў роднай прыроды да людскіх сэрцаў. Родны беларускі краявід асацыіруецца ў яго з туманам над ставам, ніцымі вербалозамі і галоўкамі кветак цымбалей (даўняя беларуская назва чыстацелу) у вершы «Над ставам дым, бы дым з балеі...»; з кармазынам (малінавым колерам) небакраю, якім ільсніцца «залатая асенняя раніца» ў аднайменным вершы; з балатамі, што «разлягліся абапал ракі» і пужаюць сваёй «гідотай», аднак і тут ёсць расліны — «кіёўкі», якія вястуюць жыццё, і заклік да святла (верш «Балаты разлягліся абапал ракі...»).

Краса людскіх сэрцаў апета Дубоўкам як самаахвярнае служэнне айчыне беларускіх адраджэнцаў: паэта Алеся Гаруна, які на той момант ужо адышоў з жыцця і памяць якога ўшаноўвалася суполкаю беларусаў у Маскве ў 1922 годзе (верш «Ад крывіцкіх балотаў да тундраў Сібіру...»), а таксама прадстаўнікоў маладога пакалення беларусаў — «сына працоўнай вёскі» і «Рагнедзінай дачкі», якія пакліканы самім часам «спагадаць бяздольнай» або ператварыць занядбаную Беларусь у квітнеючую краіну, здзейсніць яе сапраўднае адраджэнне:

Маладое пакаленне,
Прачынайся, час прыйшоў.
Залатое Адраджэнне
Кліча ўсіх пад родны схоў.

*«Спагадае хто?»*

Пасля выхаду «Стромы» разгортваецца вельмі напружаная творчая і літаратурна-арганізацыйная праца Дубоўкі. Напачатку ён — адзін з актывістаў «Маладняка», узначальваў Маскоўскую філію, у склад якой у 1924 годзе ўваходзіла 15 чалавек. Ён быў таксама адным з кіраўнікоў Цэнтральнага Бюро «Маладняка» ў Мінску і часта выязджаў для арганізацыі новых філій у іншыя гарады Беларусі (напрыклад у Магілёў). Неўзабаве ў Мінску выходзяць чарговыя кнігі яго паэзіі: «Там, дзе кіпарысы» (1925), «Трысцё» (1925), «Credo» (1926), пазней у Маскве — зборнік «Наля» (1927). У новых вершах паэта развіваюцца і ўзмацняюцца многія матывы і вобразы, што гучалі ў першым зборніку «Строма», а таксама з'яўляюцца новыя, драматычныя, з прадчуваннем трывогі, ноты. Дубоўка ізноў натхнёна апявае красу прыроды і дзявочую красу, велічную таямніцу кахання, служэнне бацькаўшчыне — Беларусі. Аднак цяпер у яго мастацкай палітры сустракаюцца і экзатычныя фарбы, звязаныя з наведваннем у 1924 годзе разам з групай пісьменнікаў Крыма. Пейзажныя краявіды, на фоне якіх разгортваецца лірычная феерыя пачуццяў, змяшчаюць у сабе вобразы знаёмага беларускага «трысця» і гонка ўзнесеных да нябёсаў паўднёвых «кіпарысаў». Гэтыя вобразы ў сваім дзівосным перапляценні знамянуюць нязменную вернасць паэзіі Дубоўкі традыцыі любаснага апявання роднага краю ў яго самых непрыкметных і някідкіх рэаліях, а таксама яе адкрытасць для новага і нязвыклага, як чужыя для беларускай глебы кіпарысы, праз якія, аднак, можна

спазнаць яшчэ глыбей сваё роднае. Менавіта кіпарысы ўспрымаюцца паэтам як ганаровая варта «свечак зялёных» на магіле Максіма Багдановіча ў Ялце, якую адшукалі беларускія паэты падчас гэтай вандроўкі: «Свечы зялёныя высока праменяць; // людзі кажуць, што гэта кіпарысы...» (верш «Нават мора змяніла свой колер»).

Паэзія Максіма Багдановіча была для Дубоўкі ўзорам высокай гармоніі формы і зместу, сапраўднай красы мастацкага слова. Ужо ў першым зборніку Дубоўка выкарыстоўваў форму трыялета (нізка «Пацеркі»), вандроўка ж узбагаціла яго новымі ўражаннямі і ўмацаваннем веры ў правільнасці абранага літаратурнага кірунку. У Крыме з'явілася ў Дубоўкі і прадчуванне новага літаратурнага «ўзвышша», да якога прывядзе шуканне свайго адметнага шляху ў творчасці, арыентаванай на ўласныя нацыянальныя традыцыі (фальклорныя і літаратурныя), а таксама скіраванай на адмысловае, у рэчышчы еўрапейскіх тэндэнцый, наватарства формы. Максім Багдановіч быў тут выдатным прыкладам. «...На узвышшы — пагурачак гэты; // ён паклікаў мяне здалёку...» — так напісаў Дубоўка пра адшуканую магілу класіка, якому наследаваў сам і на якога раіў арыентавацца іншым.

Гэта быў час бурнай літаратурнай палемікі, вызначэння «стылю эпохі», або эстэтычных і ідэалагічных прыярытэтаў. «Маладняк», перажыўшы ў 1925 годзе пік свайго творчага і арганізацыйнага ўзлёту, уступіў у паласу крызісу. Ужо ў маі 1926 года на пасяджэнні Цэнтральнага Бюро разглядалася заява групы пісьменнікаў (Язэпа Пушчы, Кузьмы Чорнага, Кандрата Крапівы, Адама Бабарэкі) аб выхадзе са складу аб'яднання. Нязгоду таленавітых пісьменнікаў выклікала менавіта тое, што «Маладняк» з літаратурнай творчай арганізацыі ператварыўся ў «прасветную». Пушча і Бабарэка ў сваіх выступленнях адзначылі заняпад мастацкасці ў «Маладняку», а таксама тое, што творчасць не можа развівацца камандаю зверху, а толькі культураю. Так адбыўся першы раскол «Маладняка»: названая група пісьменнікаў і Уладзімір Дубоўка ў тым жа годзе выйшлі з яго складу, утварыўшы новае літаратурнае аб'яднанне «Узвышша». У самой назве яго выразна прачытвалася сімвалічная альтэрнатыва: свабоднае творчае «ўзвышша» супрацьстаяла прымусовым «камандным высотам», або такому стылю кіравання літаратурнай справай, калі пісьменнікам дыктавалася зверху, што і як трэба было пісаць. Цяпер творчы лёс Дубоўкі быў непарыўна звязаны з «Узвышшам» — з гэтым сапраўдным

мастацкім узгор'ем тагачаснай беларускай літаратуры, якое падало прыклад не толькі высокай адухоўленай творчасці, але і мужнага і сумленнага служэння праўдзе, свабодзе, айчыне. Але з гэтага часу ў творчасці Дубоўкі і яго сяброў-паплечнікаў па «Узвышшы» выразна выяўляюцца і трывожна-трагічныя ноты: матывы смутку, неабходнасці супрацьстаяць злым, варожым сілам, адстойваючы права на перадачу праўдзівых пачуццяў сваёй душы, а не дзяжурных хваласпеваў сацыялістычнаму будаўніцтву.

Адстойваць сваё права на смутак і летуценні было, аднак, вельмі нялёгка ў тагачаснай рэчаіснасці. Пацверджаннем гэтаму можа быць і гісторыя з надрукаваннем вядомага верша Дубоўкі «О Беларусь, мая шыпшына». У зборніку «Credo», як вядома, ён быў змешчаны ў скарочаным і папраўленым выглядзе: радкі «Імкнешся да Камуны Свету, // каб радасць красавала скрозь» былі замененыя на «Цяпер Рэспубліка Саветаў // і радасць пунсавее скрозь», а апошні слупок з радкамі «Варожасць шляху не зачыніць, // у перашкодах дух расце...» быў зусім выкінуты, відавочна, таму, што ніяк не стасаваўся з папярэднімі радкамі пра пунсавенне радасці ў Рэспубліцы Саветаў. Толькі ў зборніку «Наля», які Дубоўка выдаў у 1927 годзе ў Маскве, ён аднавіў свой аўтарскі варыянт. Амбівалентнасць вобраза шыпшыны з яе пялёсткамі і дзідамі становіцца для Дубоўкі вельмі істотным момантам: ён вынайшаў ключавы вобраз-сімвал, які дазволіў яму глыбока і праўдзіва перадаць веліч і трагізм сваёй эпохі, а таксама прадчуванне ахвярнасці шляху паэта ў служэнні айчыне. У іншых вершах гэтага часу ён узмацняе такое прадчуванне, шукаючы новыя, але падобныя вобразы:

Часіна ды з сокам рабіны,
качаеш мяне ў чорнабыллі.
На дзіды, на востры шыпшыннік
ці сэрца, ці дух мой узбілі...

*«Часіна ды з сокам рабіны»*

Вершы зборніка «Наля» сведчаць пра абсалютную мастацкую сталасць таленту аўтара, вынашанасць і праніклівасць яго думак, уменне перадаць тонкія душэўныя зрухі і памкненні. Тут пераважаюць элегічныя настроі, зменлівасць розных эмацыйных станаў паказвае нам лірычнага героя то ўзнёсла закаханым, то перажываючым смутак і тугу расстання на фоне восеньскага адмірання «жоўтых

кляновых лістоў». Лірычны герой паўстае перад намі як летуценнік, якому не застаецца месца ў перыяд практычнага будаўніцтва — у перыяд «змагання за Камуну Свету», калі «многа нас загіне»:

Летуценнем прахаджу над краем
і загіну, быццам летуценне.
Я сумлення не прадаў у краме
у той бок і вочы не глядзелі

*«Летуценнем прахаджу над краем»*

Свае разважанні над лёсам краіны і служэннем паэта ў пару вялікіх грамадскіх зрухаў і перамен Дубоўка працягнуў у знакамітых паэмах «Кругі» (1927), «І пурпуровых ветразей узвівы» (1929), надрукаваных у часопісе «Узвышша», і «Штурмуйце будучыні аванпосты!», якая была даслана ім ва «Узвышша» ў 1929 годзе, але засталася ненадрукаванай з прычыны рэзка адмоўнай крытыкі папярэдніх паэм нядобразычлівымі апалагетамі пралетарскай літаратуры. Яны папракалі паэта ў адсутнасці разумення сучаснасці і шляхоў, якімі Беларусь крочыць у будучыню. Да таго ж над Дубоўкам, як і ў цэлым над «Узвышшам», навісла пагроза рэпрэсій за «адхіленні» ад лініі партыі, якая прадпісвала пісьменнікам апяваць перамогу рэвалюцыі і дасягненні сацыялістычнага будаўніцтва. І рэпрэсіі не прымусілі сябе доўга чакаць.

Першай ахвярай расправы над літаратурай і пісьменнікамі, над свабодай думкі і творчасці стала аб'яднанне «Узвышша» і яго самыя актыўныя сябры: Уладзімір Дубоўка, Язэп Пушча, Адам Бабарэка, Уладзімір Жылка, арыштаваныя ўлетку 1930 года і абвінавачаныя як удзельнікі па справе так званага «Саюза вызвалення Беларусі» — «контррэвалюцыйнай» «нацдэмаўскай» арганізацыі, створанай нібыта ў мэтах барацьбы з савецкай уладай за адрыў Беларусі ад пралетарскай Расіі і пабудову тут незалежнай нацыянальнай («нацыяналістычнай» у тэрмінах ДПУ) дзяржавы «буржуазнага» кшталту. Не здолеўшы даказаць існаванне такой арганізацыі, пратрымаўшы каля года ў турэмным зняволенні з допытамі і катаваннямі больш за сто чалавек беларускай інтэлігенцыі, у тым ліку і пісьменнікаў-узвышаўцаў, сталінскі рэпрэсіўны апарат вымушаны быў закрыць справу, але амаль усе вязні былі пакараныя пяцігадовай высылкай у аддаленыя ад Беларусі мясціны. Для Уладзіміра Дубоўкі пачаўся другі — пякельны — кругабег яго жыцця.

Дванцаць сем шматпакутных гадоў правёў Уладзімір Дубоўка ў выгнанні, у абсалютнай творчай ізаляцыі. Пасля адбыцця ссылкі ў Яранску замест вяртання ў Маскву або на радзіму Дубоўку чакала дзесяць гадоў канцлагера, якія ён здолеў вытрымаць. Ён выжыў і не зламаўся. Але і гэта было яшчэ не апошняе кола пакут па сталінскім пекле. У 1948 годзе ён мусіў пакінуць Грузію, якую выбраў сабе за месца жыхарства, бо пасля лагера быў ізноў пазбаўлены права вярнуцца дадому: на Беларусь або ў Маскву. Яго, як чалавека «заплямленага» перад уладай, чакала так званае «вечнае пасяленне» ў Краснаярскім краі...

Пасля рэабілітацыі ў 1958 годзе Дубоўка жыў у Маскве. Часта прыязджаў на Беларусь, займаючыся тут выданнем сваіх кніг, дзе былі папраўлены многія вершы 1920-х гадоў. Ён пісаў новыя творы, шмат перакладаў, напісаў казкі і аповесці для дзяцей. Значнымі творчымі дасягненнямі сталі для яго ў той час пераклады санетаў Шэкспіра і паэм «Бронзавы век», «Каін» і «Шыльёнскі вязень» Байрана. Сам выбар тэкстаў для перакладу быў сімвалічным і многае тлумачыў у стаўленні пісьменніка да тагачаснага жыцця.

Няпростым было ўрастанне паэта ў новую рэчаіснасць, вяртанне да любімай літаратурнай справы пасля пакутнага, вымушанага перапынку. Гэта быў трэці кругабег яго лёсу, напоўнены мудрай цярплівасцю. Дубоўка здзіўляў сучаснікаў. Здзіўляў маладым бляскам вачэй, які кантраставаў з доўгай сівой барадою; здзіўляў акцэнтамі ў паводзінах, якія многіх шакіравалі. Калі ён, сівабароды волат, ізноў з'явіўся на літаратурным небасхіле, пачаў друкавацца, прымаць удзел у жывых літаратурных дыскусіях, а таксама ў сяброўскіх вечарынах і імпрэзах, ён працягваў заставацца загадкавым чалавекам-легендай. У пісьмовых і вусных успамінах пра Дубоўку вельмі часта сустракаецца адно меркаванне: як прыхаваны дакор паэту гучыць, што ён, адбыўшы поўнае кола вязеньскага пекла і вярнуўшыся да грамадскага жыцця, быў фактычна палахлівым чалавекам — занадта асцярожлівым у выказваннях; на пісьменніцкіх вечарынах неадменна казаў тост «за кампартыю», асцерагаўся браць у бібліятэцы кнігі палітычнай тэматыкі, перарабляў на «патрэбу дня» ранейшыя свае вершы.

Гэты міф пра паэта, відавочна, не адпавядае праўдзе. Калі задумацца над Дубоўкавай «залішняй асцярожлівасцю», няцяжка заўважыць пэўную нестасоўнасць знешняга іміджу паэта і ўнутранага глыбока іранічнага разумення ім сітуацыі. Думаецца, што сучаснікі Дубоўкі ў трэцім кругабегу яго жыцця нечага патаемнага не адчулі ў самім паэце,

не зразумелі той ролі, якую ён сам абраў для сябе на сцэне рэгламентаваных грамадскіх адносін. Галоўным у гэтай ролі была глыбока схаваная іронія — усё, чым «зламаны» паэт мог аддзячыць постсталінскаму, але ўсё роўна таталітарызму. Толькі як пастаянную іронію, прычым так адмыслова схаваную, каб ніхто не разгадаў (бо ён і не жадаў, каб яе разгадалі, а яго западозрылі ў няшчырасці!),— можна вытлумачыць Дубоўкавы хваласпевы кампартыі і тую залішнюю падкрэсленасць, з якой ён гэта заўсёды рабіў. Дубоўка выдатна разумеў, у якое грамадства ён вярнуўся пасля рэпрэсій — гэта не было грамадства вольных людзей, якое магло дазволіць сабе асудзіць уладу, што знішчыла столькі бязвінных людзей. Паэт мог дазволіць сабе быць асцярожлівым, ведаючы, якой цаной можа быць акуплена нават бяскрыўднае слова. У такой сітуацыі духоўнай апазіцыяй і адначасова самаабаронай магла быць толькі яўна перабольшаная на людзях «пашана» да кампартыі. У гэтым была мудрасць і цярплівасць паэта, які ведаў Праўду жыцця, і яго ўчынкі былі адпаведныя гэтай Праўдзе. Такім мудра-цярплівым ён заставаўся да апошняй хвіліны (памёр паэт у Маскве 20 сакавіка 1976 года).

У трэцім кругабегу жыцця кнігу успамінаў Уладзімір Дубоўка назваў «Пялёсткі» (1973), нібыта вяртаючыся да ўлюбёных вобразаў сваёй маладосці, да кветкі-шыпшыны, у якой яшчэ ў 1925 годзе апаэтызаваў родную Беларусь і ўбачыў сутнасць уласнага служэння айчыне: «Пялёсткамі тваімі стану, // на дзіды сэрца накалю...» Гэтаму самаахвярнаму служэнню з праколатым дзідаю сэрцам паэт заставаўся верным да канца свайго жыцця, ва ўсе яго зорныя і пякельныя часіны, спавядаючы ідэалы вечнага хараства, сумленнасці і праўды. І яшчэ адзін вобраз быў улюбёным для паэта — гэта вобраз узвышша. Перш чым гэтае сімвалічнае слова стала назвай літаратурнага згуртавання, яно, як мы паказалі, стала вобразам у многіх вершах ранняга Дубоўкі. Ён і сам нязменна чуўся на ўзвышшы — на ўзвышшы жыцця і літаратуры. Гэтае пачэснае месца было наканавана яму і прыроджанай моцай яркага таленту, і здольнасцю прымаць на сябе найбольшую адказнасць. Бо той, хто на ўзвышшы,— не толькі арыенцір-маяк для сяброў і прыхільнікаў, але і адкрытая мішэнь для ворагаў і нядобразычліўцаў. Ён вызначае шлях, бо бачыць далей за іншых, і ён жа прымае на сябе першы ўдар, бо ён — на ўзвышшы.

*Ірына Багдановіч*